


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (532) Серада, 3 ліпеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

*Студэнцкаму будаўнічаму атраду Беларусі прысвячаецца гэты нумар*

## На работу слаўную...

Р. ПІЕНАВА,
сакратар ЦК ЛКСМБ.

Летам гэтага года 2747 студэнтаў ВНУ нашай рэспублікі будуць упершыню працаваць на будоўлях Уральскай вобласці. Цалінная будоўля—вельмі адказная справа беларускага студэнцтва. За 2 з паловай месяцы будзе пабудавана 217 аб'ектаў на агульную суму 2700 тысяч рублёў. Сярод будаўнічых аб'ектаў — школы, дзіцячыя сады, жыллёвыя памяшканні, рамонтныя майстэрні і г. д. Самыя складаныя будоўлі будуць весці атрады БПІ, БІЧТ, мінскіх медыцынскага і тэхналагічнага інстытутаў. Працаваць прыдзецца ў незвычайных для нас кліматычных умовах. Таму на цаліну едуць самыя стойкія, мужныя, упартыя.

Зараз ва ўсіх вышэйшых навучальных установах закончана камплектаванне саўгасных будаўнічых атрадаў, створаны брыгады і штабы атрадаў. Зацверджаны таксама рэспубліканскі штаб цалліннікаў і рэдакцыя атраднай шматтыражкі. Камандзірам рэспубліканскага атрада назначан Ноліс Варонін, камісарам — Вячаслаў Макарэўскі, галоўным інжынерам — Іван Здзесеў.

Амаль ва ўсіх ВНУ было арганізавана навучанне будаўнічай справе. Студэнты працавалі на будоўлях пад кіраўніцтвам вопытных прарабаў і рабочых, набывалі практычныя навыкі.

Наш рэспубліканскі будаўнічы атрад ці, як яго ў жарт называюць студэнты, «будаўнічая студэнцкая фірма» забяспечана будаўнічымі інструментамі, механізмамі і спецвопраткай.

Паміж усімі саўгаснымі атрадамі будзе арганізавана спаборніцтва за камуністычную працу і быт, ход якога будзе пастаянна асвятляцца ў шматтыражцы. Камітэты камсамола ВНУ ўстанавілі пераходныя вымпелы лепшым брыгадам. Лепшаму атраду па выніках будаўніцтва будзе ўручан Памятны Чырвоны Сцяг Заходне-Казахстанскага крайкома камсамола.

Беларускія студэнты, акрамя будаўніцтва, будуць праводзіць вялікую шэфскую работу: даваць канцэрты мастацкай самадзейнасці, праводзіць гутаркі, працаваць з дзецьмі, будаваць на грамадскіх пачатках спортпляцоўкі. У многіх ВНУ падрыхтаваны стэнды, якія расказваюць аб нашай рэспубліцы, аб беларускай камсамоліі і піянерыі. Студэнты павязуць у падарунак моладзі і школьнікам вобласці бібліятэчкі, спортінвентар, музыкальныя інструменты, наглядныя дапаможнікі, піянерскую атрыбутыку.

У кожным атрадзе на перыяд будаўнічых работ ствараюцца партыйная і камсамольская арганізацыі. Жыццё атрада, яго поспехі і недахопы будуць асвятляцца ў асабістых насценгазетах, баявых лістках. У вольны ад работы час будуць праводзіцца спартыўныя спаборніцтвы, аднадзённыя паходы, вечары дружбы з мясцовай моладдзю. Адным словам, атрады будуць жыць напружаным, але багатым жыццём.

Падрыхтоўка атрадаў да работы на цаліне паспяхова заканчваецца. Перад ад'ездам кожнаму студэнту будзе ўручана пуцёўка ЦК ЛКСМ Беларусі.

Хочацца пажадаць нашаму будаўнічаму атраду вялікіх поспехаў у працы на цаліне!




### ЦАЛІНА ПАЧЫНАЕЦЦА З АБ'ЯВЫ

*Гаварыць, не толькі добры канец, але і добры пачатак — справы вянец. Сапраўды так. Цаліна для студэнтаў Белдзяржуніверсітэта пачалася з гэтай вось аб'явы. Прачытаўшы яе, наўрад ці хто сазнаўся, што ён хілы, не моцны целам і душой, што ён не любіць працу, песні, весялосць. Вось чаму было столькі многа заяў, асабліва ад дзяўчат. Праўда, іх чакала расчараванне: надта мала ўзялі іх на цалінныя будоўлі. Затое цяпер, пасля палёту Валянціны Церашковай, яны ходзяць ганарыстыя — вось, маўляў, мы якія!*

*Едуць на цаліну 282 студэнты. Едуць паэты і цесляры, музыканты і муляры, бетоншчыкі, майстры на ўсе рукі. Едуць людзі гарачых сэрцаў.*

*Шчаслівай дарогі, хлопцы! Шчаслівай дарогі, дзяўчаты! Поспехаў вам!*

# СТАТУТ
## ударнага будаўнічага студэнцкага атрада Беларусі

### АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ АТРАДА

Студэнцкі будаўнічы атрад Беларусі створан па рашэнню ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ. Атрад з'яўляецца ўдарным. Яго мэта — будаўніцтва жылых дамоў, школ, культурна-бытавых і вытворчых аб'ектаў у саўгасах Заходне-Казахстанскага краю.

Сваё жыццё і дзейнасць студэнцкі атрад вымярае прынцыпамі маральнага кодэкса будаўніка камунізма.

Асноўныя задачы атрада: выдатна спраўляцца з вытворчымі заданнямі, трымаць раўненне на ўзорную якасць работ, выхоўваць у членаў атрада камуністычныя адносіны да працы, сябраваць з мясцовымі камсамольскімі арганізацыямі, быць іх саюзнікамі ў прапагандысцкай, лекцыйнай, культурна-масавай і спартыўнай рабоце, быць калектыўным сябрам мясцовых школьнікаў.

Спаборнічаць за камуністычную працу і быт — абавязак кожнага, хто атрымлівае пуцёўку члена атрада.

### АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА АТРАДА

Саўгасны будаўнічы атрад — наша аснова. Ён складаецца з вытворчых брыгад. Усёй дзейнасцю саўгаснага атрада кіруе штаб, у састаў якога ўваходзяць камандзір, камісар, парторг, камсорг, загадчык гаспадаркі, брыгадзіры. Штаб зацвярджаецца камітэтам камсамола ВНУ.

У студэнцкіх саўгасных атрадах на час будаўнічых работ ствараюцца партыйная і камсамольская арганізацыі.

Саўгасныя атрады, якія працуюць на тэрыторыі аднаго вытворчага ўпраўлення, аб'ядноўваюцца ў раённы атрад, узначальваемы раённым штабам.

Атрады Уральскай вобласці ствараюць будаўнічы студэнцкі атрад Беларусі, усёй дзейнасцю якога кіруе рэспубліканскі штаб, зацверджаны ЦК ЛКСМБ і Уральскім АК КП Казахстана. Рэспубліканскаму штабу належыць права канчатковага рашэння ўсіх пытанняў працы і быту членаў атрада.

Друкаваным органам рэспубліканскага атрада з'яўляецца шматтыражка, створаная на базе абласной газеты «Приуралье».

### АБАВЯЗКІ ЧЛЕНА АТРАДА

Стаўшы членам атрада, ты абавязан высока несці званне камсамольца, быць прыкладам у працы, узорам у дысцыпліне, інтарэсы справы, інтарэсы калектыву павінны заўсёды быць вышэй тваіх асабістых інтарэсаў. Стаўшы членам атрада, ты робішся баявым агітатарам, сябрам дзяцей, застрэльшчыкам у палітычнай, спартыўнай і культурна-масавай рабоце. Ты пастаянна памятаеш, што тваёй дапамогі чакаюць групы садзеяння партыйна-дзяржаўнага кантролю, пасты «Камсамольскага пражэктара», народныя дружыны.

Ты не толькі па-ўдарнаму працуеш, ты паказваеш прыклад клапатлівых адносін да тэхнікі, інструментаў, да ўсіх матэрыяльных каштоў-

(Заканчэнне на 2 стар.).

## У дарогу!

Сёння ноччу адпраўляецца ў шлях першы эшалон з беларускімі студэнтамі-будаўнікамі. Ці ўсё гатова ў нас, цаліннікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна?

21 чэрвеня ў г. Уральск адпраўлены вагоны з інструментамі і палявой кухняй для саўгаса «Стэпавага». Туды ж 25 чэрвеня выехала група квартыр'ераў. У саўгасах, дзе мы будзем працаваць, яны павінны рашыць рад пытанняў з тым, каб саўгасы як мага лепш падрыхтаваліся да нашага прыезду.

Усе члены будаўнічых атрадаў ведаюць мэты і задачы, якія стаяць перад намі. Праведзеныя сходы будаўнічых атрадаў паказалі, што ўсе будаўнікі поўныя рашучасці выканаць гэтыя задачы.

Кожны атрад атрымаў спартыўны інвентар. 3-му атраду выдзелен магнітафон, 2-гі атрад купіў праігрывацель. У падарунак цалінным школам і бібліятэкам мы вязём каля 1500 кніг, хімрэактывы, абсталяванне для хімічных і фізічных кабінетаў.

Атрады поўнасцю забяспечаны аптэчкамі, стэндамі, спецыяльнай літаратурай, флагштокамі, канцылярскімі прыналежнасцямі, пасцельнымі прыналежнасцямі, палаткамі.

К. СУЧКОЎ,
начальнік штаба цаліннікаў БДУ імя У. І. Леніна.

# СТАТУТ
# ударнага будаўнічага студэнцкага атрада Беларусі

(Пачатак на 1 стар.).

насцей атрада і саўгаса, не забываеш правілы тэхнікі бяспекі.

Унутраны распарадак жыцця атрада, рашэнні штабоў і распараджэнні яго кіраўнікоў — для цябе закон.

Ты павінен умець мужна пераадольваць цяжкасці, заўсёды ў любых абставінах быць падцягнуты і ахайны, быць сціплым чалавекам, добрым таварышам.

Памятай, што «цаліна» пачынаецца ў дарозе, а таму «сухі закон» уступае ў сілу з моманту пасадкі ў эшалон.

Ведай, што ў камсамола ВНУ моцная даўняя дружба з працаўнікамі цаліны. Зрабі ўсё, каб яна стала яшчэ больш трывалая.

### ЗААХВОЧВАННІ І ПАКАРАННІ

1. Той, хто добра праявіў сябе у працы і грамадскай дзейнасці, рашэннем штаба саўгаснага атрада прадстаўляецца да ўзнагароджання камсамольскімі і савецкімі органамі. Рашэнне штаба саўгаснага атрада зацвярджаецца агульным сходам атрада, раённымі і рэспубліканскім штабамі.

Лепшаму саўгаснаму студэнцкаму атраду, пераможцу спаборніцтва, будзе ўручан Памятны Сцяг Заходне-Казахстанскага крайкома камсамола.

2. Той, хто парушыў статут атрада і нормы камсамольскага жыцця, атрымлівае спагнанне аж да выгнання з цаліннага атрада.

Прапанова штаба аб камсамольскім спагнанні абмяркоўваецца на сходзе атрада і падлягае зацвярджэнню камітэтам камсамола ВНУ.

* * *

Няхай кожны працуе так, каб памяць аб будаўнічым атрадзе ўвасобілася ў дамы, школы, культурна-бытавыя будынкі.

Няхай у Заходне-Казахстанскім краі застанецца добрая слава аб беларускіх студэнтах.

ЦК ЛКСМ Беларусі.



На здымку: *студэнты фізічнага факультэта БДУ Дзмітрый Саковіч і Васілій Чумакоў у камітэце камсамола праглядаюць кнігі, сабраныя студэнтамі універсітэта для цалінных бібліятэк.*

Фота Я. Карпінчыка, студэнта 4 курса хімфака БДУ

## Нашы карэспандэнты паведамляюць

## З любой задачай справімся

У пакой камітэта камсамола Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута пастукалі:

— Калі ласка! — незадаволена выгукнуў адзін з хлопцаў, што сядзелі за сталамі і аб нечым спрачаліся. — Відаць, зноў з заявамі. І калі гэта...

Ен не паспеў дагаварыць — увайшлі трэцякурсніцы Галя Казакова і Галя Ванькевіч. Дзяўчаты працягнулі паперкі.

— На цаліну хочам ехаць... Працаваць! — паспешліва загаварылі яны.

— А што вы рабіць там будзеце, на цаліне? Відаць, нічога і не ўмееце, — ці то жартам, ці то сур'ёзна сказаў Ігар Татарэнка.

— Да паступлення ў інстытут я на заводзе штучнага валакна працавала, — пакрыўдзілася Галя Казакова.

— Я таксама працавала, — падтрымала яе Галя Ванькевіч.

— Дык там жа будаўнікі патрабуюцца! Разумееце, бу-даў-ні-кі! А вы, пэўна, і раствор замяшаць не сумееце, — гарачыўся Ігар.

Але дзяўчаты і не думалі адступаць.

— Навучымся, калі не ўмеем.

«Навучымся»... Відаць, тады і прыйшла да камандзіра будучага цаліннага будаўнічага атрада думка аб стварэнні вучнёўскіх брыгад са студэнтаў.

Пасля лекцый хлопцы і дзяўчаты ішлі на будоўлю, дзе вопытныя рабочыя дапамагалі ім авалодваць прафесіяй муляра, цесляра, тынкоўшчыка.

Не будзе сорамна магіляучанам за свой атрад, які ў асноўным складаецца з былых ударнікаў палёў і заводаў.

А. Сербантовіч.

## Да ад'езду гатовы

Дзейсна прайшла падрыхтоўка да ад'езду на будоўлі Казахстана ў Беларускім тэхналагічным інстытуце імя С. М. Кірава. Сіламі студэнтаў тут нарыхтавана 1000 ручак для рыдлёвак, зроблена 400 кельмаў, падрыхтаваны сякеры, напільнікі і іншыя неабходныя інструменты.

Паклапаціліся будучыя будаўнікі і аб сваіх жыллёвых умовах. Яны маюць палаткі на 200 месц, кухоннае абсталяванне, пасцельныя прыналежнасці.

Навучэнцам цалінных школ тэхнолагі падрыхтавалі падарункі: камплекты рэчываў і прыбораў для хімічных і фізічных кабінетаў.

(Наш кар.)



На здымку: *студэнты Мінскага медінстытута авалодваюць будаўнічай справай на ўзвядзенні новага вучэбнага корпуса.*

Фота П. Канцавога.

## Едуць віцябляне

Старанна падрыхтаваліся да паездкі на цалінныя будоўлі студэнты віцебскіх інстытутаў — медыцынскага і педагагічнага. У кожны атрад віцяблян уваходзяць па 110 чалавек. Гэта тыя, хто ў мінулым годзе працаваў на ўдарнай камсамольскай — нафтабудзе. Вось іх імёны: Сямён Дубовік і Ларыса Уткіна, Уладзімір Несцераў і Сямён Тугарынаў з медінстытута, Вячаслаў Макарэўскі і Юрась Цалуйка з пединстытута і многія-многія іншыя.

А навічкі? Ёсць і яны. Але поўны сэнс гэтага слова ў адносінах да іх губляецца. Навічкі настойліва вучыліся ў рабочых, у сваіх таварышаў па прафесіі будаўнікоў.

(Наш кар.)

Віцебск.

## Ім не ўпершыню будаваць

Тэрэза Суша і Ігар Ісаенка займаюцца на трэцім курсе, але на розных факультэтах.

Тэрэза вучыцца на гістарычным, Ігар — на агранамічным. Іх аб'ядноўвае не толькі тое, што яны студэнты. Яны яшчэ і будаўнікі. Да паступлення ў Брэсцкі педагагічны інстытут Тэрэза працавала тынкоўшчыкам, Ігар — цесляром.

На будоўлях Казахстана яны зноў займуцца сваёй любімай працай. Ім да сваіх былых прафесій не прывыкаць!

(Наш кар.)

БРЭСТ (па тэлефоне).

# Край, дзе будуць працаваць беларускія студэнты

*Старшы выкладчык кафедры будаўнічых канструкцый Беларускага політэхнічнага інстытута Г. А. Качаноўскі ў саставе групы разведчыкаў камсамола Беларусі пабываў ва Уральскай вобласці. Мы друкуем сёння ў скарачэнні артыкул Г. А. Качаноўскага, які расказвае аб краі, дзе будуць працаваць будаўнічыя атрады беларускіх студэнтаў.*

Уральская вобласць знаходзіцца на паўночным захадзе Казахскай ССР. Клімат яе рэзка кантынентальны. У зімовы час часта бываюць бураны, у летні — моцныя пыльныя буры і сухавеі.

Найбольш характэрны рэльеф вобласці — раўніны. У паўднёвай частцы вобласці, на граніцы з Гур'еўскай вобласцю, распасціраецца Прыкаспійская нізіна. На поўнач ад яе паднімаецца Урала-Эмбенскае плато.

Праз усю вобласць з поўначы на поўдзень нясе свае воды хуткая рака Урал. Яна ўпадае ў Каспійскае мора ля г. Гур'ева. Найбольш буйныя прытокі Урала на тэрыторыі вобласці — Кушум, Чаган, Барбастаў, Вялікі і Малы Узень.

Рака Урал мае шырокую даліну, якая ў асобных месцах даходзіць да 20—30 кіламетраў. Абалона ракі дасягае шырыні 7—10 кіламетраў. Вясной Урал шырока разліваецца, а ўлетку адбываецца марудны спад вады. Аднак у перыяды моцных дажджоў узровень вады улетку хутка паднімаецца.

На тэрыторыі вобласці маецца вялікая колькасць бяссточных рэк, якія ствараюць у вусцях азёры і разлівы. У час паводкі рэкі, перапоўненыя вадой, скідваюць яе ва ўпадзіны, ствараючы азёры і разлівы.

Сярод вялікай колькасці азёр шмат салёных. Найбольш буйныя азёры — Чалкар, Балыкта, Рыбны Сакрыл.

Для вобласці характэрныя таполе-вязавыя лясы. У нізоўях рэк Кушум і Камыш, ля Самарскіх азёр распасціраюцца вялікія масівы лугоў з пырэйна-вастрацовымі травамі. У мясцовым калгасе «Шлях да камунізма» нам казалі, што гэтыя лугі даюць па 30—35 цэнтнераў сена з гектара. У раёне саўгаса «Пяцімарскі» маюцца альпійскія лугі.

На тэрыторыі вобласці водзяцца сайгакі, дзікі, ваўкі, лісіцы, суслікі, тхары, змеі. Найбольш часта нам сустракаўся «вялікі звер» — суслік.

Рэкі і азёры вобласці, у літаральным сэнсе слова, кішаць рыбай, вуткамі, гусямі. Найбольш багатыя рэкі і азёры сазанам, судаком, акунём. У краязнаўчым музеі экспануюцца таксама асётр і бялуга, якія заходзяць з нізоўяў у раку Урал.

Асноўнае насельніцтва Уральскай вобласці — казахі, рускія і украінцы. Прычым асноўная частка жыхароў жыве на поўначы вобласці і ў далінах рэк. Паўднёвыя раёны ў асноўным заселены казахамі, паўночныя — рускімі і украінцамі. Маланаселенасць поўдня адбіваецца на ходзе жыллёвага і вытворча-гаспадарчага будаўніцтва. Нашым камсамольскім атрадам прадстаіць вялікая работа па ўзвядзенню тут будынкаў.

У гутарках з дырэктарамі саўгасаў выявілася, што будаўніцтва у асноўным вядуць сезонныя арбочыя з Арменіі, Дагестана і Украіны, якія не ў стане асвоіць усе сродкі, што адпускаюцца на будаўніцтва.

Асноўнымі галінамі народнай гаспадаркі ў вобласці з'яўляюцца жывёлагадоўля мяса - шэрстнага кірунку і перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны. Галоўныя галіны прамысловасці — харчовая і лёгкая. Ва Уральску маюцца вялікі мясакамбінат, малочны камбінат, мукамольны завод, рыбакамбінат, элеватары. Развіваецца і машынабудаўнічая прамысловасць.

Жывёлагадоўля патрабуе вялікіх зямельных масіваў для выпаса авечак, буйнай рагатай жывёлы, коней і вярблюдоў. Некаторыя саўгасы маюць да 200—300 тысяч гектараў. Пры такіх вялікіх маштабах ствараецца вымушаная тэрытарыяльная раскіданасць жывёлагадоўчых ферм з адносна невялікім аб'ёмам будаўнічых работ у адным месцы.

Развіццё калгасна-саўгаснай гаспадаркі і рост культурна-бытавых запатрабаванняў працаўнікоў вёскі выклікалі масавае будаўніцтва як культурна-бытавых і грамадскіх будынкаў, так і вытворча-гаспадарчых.

Я бачыў у многіх населеных пунктах дабротныя жылыя дамы, школы, клубы, бібліятэкі, бальніцы, лазні, жывёлагадоўчыя будынкі, гаражы, зернесховішчы, рамонтныя майстэрні і г. д. Усё гэта радуе любога савецкага чалавека, і міжволі дзякуеш партыі і ўраду за іх клопаты аб савецкім чалавеку.

Г. А. Качаноўскі,

ст. выкладчык кафедры будаўнічых канструкцый БПІ.

*(З газеты «Советский инженер» № 20 за 1963 г.).*

*У падрыхтоўцы цаліннага нумара да друку ўдзельнічалі члены рэдакцыі цаліннай шматтыражнай газеты студэнты 4 і 5 курсаў аддзялення журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна* Іван Дашчынскі, Андрэй Кукевіч, Анатоль Сербантовіч.

За рэдактара Я. ЛЯХАЎ.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03951. Тыр. 2000. Зак. 2424